

*БЯСПАЛАЯ Марыя Аркадзьеўна,* загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар гістарычных навук, прафесар.

Аўтар навуковых, навукова-метадычных прац і шматлікіх артыкулаў па праблемах эканамічнага і сацыякультурнага развіцця Беларусі XIX–XX стст.

*Публікуецца ў часопісе «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» з моманту яго заснавання.*

# АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СІТУАЦЫІ Ў МІНСКУ НА МЯЖЫ XIX–XX стст.

*Разглядаецца складаны працэс фарміравання сацыякультурнай сітуацыі ў губернскім Мінску ў канцы XIX – пачатку XX ст., якая вызначалася такой выразнай адметнасцю, як адначасовае суіснаванне ў гарадской прасторы розных этнічных культур. Звяртаецца ўвага на аб'ектыўную заканамернасць актывізацыі культурнага жыцця Мінска ў вызначаны перыяд, уплыў русіфікатарскай (асімілятарскай) палітыкі правячых колаў, асаблівасці гарадской сацыякультурнай сітуацыі.*

Не сладок плод бесцельного досуга,
и праздному не помогает Бог.

*Софокл*

Пачатак актыўнага ўзнікнення грамадскіх арганізацый у Расійскай імперыі вызначылі рэформы 60–70-х гг. XIX ст., а 90-я гг. сталі перыядам уздыму аматарскага грамадскага руху. Па ўсёй дзяржаве ў гэты час дзейнічала больш за 900 разнастайных грамадскіх аб'яднанняў [9, с. 52]. Безумоўна, правінцыяльны Мінск не мог пахваліцца тавызначальныя і ўплывовыя аб'ектыўныя акалічнасці, якія можна аднесці да заканамерных, як павышэнне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, пашырэнне інфармацыйных магчымасцей і кантактаў у тагачасным грамадстве, актывізацыя мабільнасці жыхароў, што сакім размахам, аднак сацыякультурная сітуацыя ў горадзе развівалася ў тым жа рэчышчы. Задавалі тон грамадскага і культурнага жыцця горада шматлікія таварыствы, аматарскія аб'яднанні – навуковыя, сельскагаспадарчыя, медыцынскія і інш., якія па меры магчымасцей ажыццяўлялі асветніцкую работу. Нельга не звярнуць увагу і на такія дзейнічала хуткаму пранікненню ў гарадское асяроддзе каштоўнасцей іншых культур і з'яўленню новых рэалій грамадскага жыцця.

Яшчэ адной заканамернай прычынай фарміравання адметнай сацыякультурнай сітуацыі можна лічыць актыўнае эканамічнае развіц-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цё губернскага Мінска ў разглядаемы перыяд і не толькі таму, што ён з'яўляўся цэнтрам буйнейшай беларускай губерні*. Па заключэнні даследчыкаў, адной з прычын пераўтварэння горада ў значны эканамічны і культурны цэнтр з'яўлялася яго выгаднае геаграфічнае становішча. Мінск апынуўся на скрыжаванні важнейшых чыгуначных магістраляў, у акружэнні Прыбалтыйскага, Цэнтральнага, Украінскага, Пецярбургскага, Варшаўскага прамысловых раёнаў, што стварала «спрыяльны падмурак не толькі для росту горада, але і для фарміравання беларускага нацыянальнага рынку ўвогуле, у цэнтр якога паступова ён пераўтварыўся» [14, с. 73]. Відавочным было павелічэнне колькасці гарадскіх жыхароў. На момант Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі ў 1897 г. у Мінску пражывала амаль 95 тыс. чалавек, каля 40% мінчан былі заняты ў прамысловасці, будаўніцтве, на транспарце [14, с. 223].

Арганізацыя і дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў абумоўлівалася палітыкай царскага ўрада. У 1874 г. для ўзмацнення «ўрадавага нагляду за праявамі грамадскага жыцця» зацверджаны прыкладны статут грамадскіх сходаў (клубаў). На іх забаранялася прысутнічаць навучэнцам, жанчынам, непаўналетнім і г. д. На кожнае мерапрыемства запрашаўся паліцэйскі чын [4, спр. 35592, л. 201]. 14 жніўня 1881 г. выдадзена «Палажэнне аб узмоцненай ахове», згодна з якім губернатар атрымаў права «забараняць розныя народныя, грамадскія і нават прыватныя сходы, як на пэўны тэрмін, так і на нявызначаны» [4, спр. 8508, л. 2–29].

Рост грамадскай актыўнасці і хадайніцтвы з месцаў прымусілі дзяржаўныя органы скарацiць і спрасцiць працэдуру стварэння аматарскіх аб'яднанняў. Былі распрацаваны нармальныя (прыкладныя) статуты для навуковых, сельскагаспадарчых, дабрачынных, музычных і інш. таварыстваў. Пералічаныя вы-

*Назва «беларускай» ужыта не выпадкова, падставай гэтаму з'яўляецца факт аддзялення ў 1869 г. Магілёўскай і Віцебскай, а ў 1870 г. – Мінскай губерняў ад Віленскага генерал-губернатарскага ўпраўлення і падпарадкаванне кожнай з іх кіраванню непасрэдна з Пецярбурга. З гэтага часу ў адміністрацыйным лексіконе ў адносінах да пералічаных губерняў ужывалася назва «беларускія», а Віленская, Гродзенская і Ковенская захавалі назву «паўночна-заходнія». Гэта было зроблена дзеля таго, на думку магілёўскага губернатара, каб паказаць усяму насельніцтву, што прызнанне Беларусі рускай вобласцю ёсць факт непазбежны. Характэрна, што ў беларускіх губернях не былі адменены важнейшыя законы і пастановы, выдадзеныя для Паўночна-Заходняга краю, тым самым межы поўнасцю не зніклі. Для дасягнення мэты нашага артыкула важнае значэнне мае той факт, што і пасля абвешчанага аддзялення згаданых губерняў у важнейшай справе асветы яны прадаўжалі падпарадкоўвацца адміністрацыі Віленскай навучальнай акругі [3, с. 267, 268].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэй урадавыя пастановы можна назваць першым этапам дзяржаўнага ўздзеяння на развіццё грамадскага аматарскага руху. Другі, аб чым будзе сказана ніжэй, пачнецца пасля падзей 1905–1907 гг.

На пачатку XX ст. заходнія губерні ўяўлялі сабой клубок нацыянальных, рэлігійных, моўных і іншых праблем. Развіваўся актыўны нацыянальны рух, новую вастрыню набылі сацыяльныя супярэчнасці як у аграрным пытанні, так і ў прамысловасці, праблема грамадзянскага раўнапраўя, што азначала ліквідацыю дыскрымінацыі па этнічных і рэлігійных прыкметах, праблема адукацыі на роднай мове, патрабаванні нацыянальнай аўтаноміі, мясцовага самакіравання і палітычнага прадстаўніцтва.

Адной з важнейшых асаблівасцей, якая непасрэдна ўплывала на сацыякультурную сітуацыю ў Мінску, з'яўлялася этнічная разнастайнасць яго насельніцтва: беларусы складалі 8,2%, рускія – 34,8%, яўрэі – 43,3%, палякі – 11,4%, татары – 1,3%, немцы – 0,9% [13, с. 11]. Заўважым, што Мінская губерня ўключала Цэнтральны і частку Палескага этнаграфічных рэгіёнаў і Мінск стаў выконваць ролю ядра, вакол якога пачала фарміравацца беларуская нацыя.

Адметнасцю сацыяльнай структуры жыхароў Мінска было існаванне значнай колькасці буйных землеўласнікаў, што ўплывалі на эканамічнае і культурнае жыццё горада. Прычынай гэтага стала забарона пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. памешчыкам каталіцкага веравызнання набываць зямлю для пашырэння сваіх уладанняў, аднак на аналагічныя дзеянні ў межах горада такая забарона не дзейнічала. У выніку многія буйныя памешчыкі, напрыклад граф К. Чапскі, які амаль 10 гадоў быў гарадскім галавой, члены сям'і Ваньковічаў набылі значныя ўчасткі зямлі і лесу, а таксама нерухомасць у межах Мінска.

Пасля таго, як у канцы 1870-х гг. было дазволена адкрываць губернскія сельскагаспадарчыя таварыствы, дзейнасць якіх абмяжоўвалася толькі эканамічнымі пытаннямі, такое таварыства з'явілася і ў Мінску. Ініцыятарамі стварэння былі прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, аднак з цягам часу і кіраўніцтва таварыствам і членства ў ім стала прэрагатывай памешчыкаў Мінскай губерні. Калі ўлічыць, што ім належала каля 55,8% зямель [6, с. 10], то відавочнымі становяцца выключная эканамічная роля, якую набывала новае таварыства, і працэс умацавання карпаратыўнай культурнай ідэнтычнасці польскамоўнага насельніцтва.

Другую эканамічна важную групу ў губернях Паўночна-Заходняга краю і Мінска складала яўрэйская буржуазія, што валодала паловай усіх фабрык і заводаў, 84,5% купцоў таксама былі яўрэямі [6, с. 11]. Сярод яўрэйскага насельніцтва горада былі распаўсюджаны дабрачынныя арганізацыі дапамогі бедным: дзяцей аддавалі ў рамесныя вучылішчы ці прыватныя майстэрні. Акрамя гэтага займаліся ўладкаваннем малалетніх у сіроцкія дамы, дзіцячыя прытулкі, распаўсюджвалі кнігі маральна-выхаваўчага зместу, займаліся выхаваннем сірот і дзяцей беднякоў.

Што датычыцца рускіх, то іх колькасць сярод тагачасных жыхароў, згодна прыведзеных вышэй лічбаў, была нязначнай, такой жа была іх роля ў эканамічным жыцці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краю, затое адміністрацыйныя рычагі былі ў іх руках. Рускія займалі практычна палову (49,09%) усіх чыноўніцкіх пасад, складалі трэць мясцовай інтэлігенцыі – 34,3% з амаль 55 тыс. яе прадстаўнікоў, што знаходзіліся на грамадскай, саслоўнай, дабрачыннай службе, займаліся юрыдычнай практыкай, адукацыйнай, навуковай, медыцынскай дзейнасцю [1, с. 28]. Адзначым, што большасць прадстаўнікоў інтэлігентных колаў горада былі выхадцамі з так званых разначынцаў – купцоў, святароў, мяшчан, сялян; дваране пераважалі сярод дзяржаўных служачых, ваенных, выкладчыкаў. Для большасці рускіх, якія пражывалі ў горадзе, беларуская зямля не была роднай, малазнаёмай і малазразумелай з’яўляліся мова і культура мясцовага насельніцтва. Аднак прапанаваныя рускай дэмакратычнай інтэлігенцыяй формы культурнага аматарства паступова станавіліся адметнай з’явай сацыякультурнага жыцця горада.

Колькасць беларусаў сярод жыхароў горада была нязначнай, адпаведнай была іх роля ва ўнутрыгарадскім жыцці. У разглядаемы перыяд актыўна развіваліся працэсы самаідэнтыфікацыі беларусаў, фарміраваліся нацыянальная ідэя і праграма. Галоўную ролю ў гэтым працэсе выконвалі ўраджэнцы Мінска І. і А. Луцкевічы. Ніжэй мы звернем увагу на прысутнасць у сацыякультурнай дзейнасці некаторых грамадскіх аб’яднанняў Мінска планаў вывучэння беларускай культуры.

Прычыны актывізацыі грамадскага і культурнага жыцця губернскага Мінска на рубяжы XIX–XX стст. мы пазначылі вышэй. Аднак важнейшае значэнне ў гэтым працэсе мела ініцыятыва гарадской інтэлігенцыі, накіраваная на развіццё арганізаванага аматарства.

Кожная рэлігійна-культурная еднасць Мінска мела свае аматарскія суполкі, у той жа час дзейнічалі агульнагарадскія аб’яднанні, такія, напрыклад, як Мінскае дабрачыннае аб’яднанне, створанае яшчэ ў 1811 г., аб’яднанні «Міласэрнасць», падтрымкі навучэнцаў, апякунства сем’яў сасланых катаржан, Таварыства ўрачоў, Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. Усе аматарскія аб’яднанні горада можна аднесці да дзвюх плыняў: адны з іх былі накіраваны на фарміраванне адпаведнага культурнага асяроддзя, напрыклад Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, «Ognisko», «Sokal», «Oswiata», другія аб’яднанні, пераважна дабрачынныя і ўзаемнай дапамогі, дзейнічалі ў кірунку паляпшэння сацыяльна-бытавых умоў насельніцтва. Прыведзеная градацыя адпавядае высновам спецыяльных даследаванняў праблем актывізацыі грамадскага жыцця ў азначаны перыяд, што выразна адлюстроўваецца ў дзейнасці грамадскіх аматарскіх аб’яднанняў [10, с. 53].

З канца XIX ст. да пачатку рэвалюцыі 1905–1907 гг. сацыякультурная сітуацыя ў Мінску ў значнай ступені вызначалася дзейнасцю Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, якое пачало сваю працу ў 1898 г. Ініцыятарамі яго заснавання былі галоўным чынам прадстаўнікі мясцовага рускага чыноўніцтва, ваенныя, урачы, юрысты і інш. Можна прывесці прозвішчы А. Аляксандрава, А. Хаванскага, Р. Яноўскага, С. Каменскага, П. Грацыянава і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавасць выклікае асоба старшыні таварыства А. Ф. Аляксандрава. Да пераезду ў Мінск ён працаваў у Саратаве, горадзе, які, на думку сучаснікаў, пераўзыходзіў «па культурным прагрэсе і еўрапеізацыі іншыя “пензы”» [10, с. 54]. У Саратаве А. Аляксандраў узначальваў Таварыства прыгожых мастацтваў, свой вопыт і ініцыятыўнасць ён выкарыстаў на новым месцы працы. Маючы тытул статскага саветніка, А. Аляксандраў у Мінску займаў пасаду рэвізора губернскай акцызнай управы, быў членам гарадскога камітэта Апякунства народнай цвярозасці, рэвізійнай камісіі Таварыства мастацка-прамысловага музея пры камерцыйным вучылішчы. Разам з жонкай Верай Данілаўнай – дачкой вядомага пісьменніка Д. Мардóўцава і блізкай сяброўкай украінскай паэтэсы Лесі Украінкі, актыўна ўдзельнічаў у стварэнні Таварыства аховы жанчын. Найлепшую характарыстыку А. Аляксандраву, а ў яго асобе і іншым прадстаўнікам дэмакратычнай інтэлігенцыі горада, даў вядомы пісьменнік Я. Чырыкаў, які пяць гадоў працаваў у Мінску: «Аляксандр Фёдаравіч увасабляў сабой тып чалавека, які выпрацавалі сярод рускай інтэлігенцыі запаветы 60-х гадоў – бадзёры, стойкі, магутны духам, што не ведаў стомы ў грамадскай рабоце. Яго знаходжанне ў горадзе вызначылася значным уздымам культурна-асветніцкай дзейнасці. Ён усюды быў ініцыятарам<…>, не будучы партыйным чалавекам, здолеў аб’яднаць усіх значных людзей горада, адданых дадзенай справе» [12, с. 23, 24].

Мы не будзем раскрываць дастаткова доўгі і складаны працэс стварэння аматарскай арганізацыі, адзначым толькі, што ініцыятыва мясцовай інтэлігенцыі была падтрымана мінскім губернатарам князем М. Трубяцкім, іншымі высокапастаўленымі чыноўнікамі. Улады маглі кантраляваць дзейнасць таварыства досыць пільна, нават у статуце быў запісаны параграф аб абавязковай прысутнасці паліцыі на ўсіх мерапрыемствах і аб пастаноўцы п’ес, дазволеных паліцыяй. У выніку, на падставе толькі паліцэйскім уладам вядомых дакументаў былі забаронены пастаноўкі такіх п’ес, як «Гора ад розуму», «Лес» і інш.

Таварыства ставіла сваімі мэтамі збліжэнне мясцовай інтэлігенцыі, развіццё і распаўсюджванне ведаў па розных галінах мастацтва, супрацоўніцтва з іншымі дабрачыннымі суполкамі. За кароткі перыяд існавання (каля 6-ці гадоў) яно ўнесла значны ўклад у культурнае жыццё Мінска. Чатыры секцыі таварыства – музычная, драматычная, літаратурная і мастацкая праз год пасля стварэння аб’ядноўвалі каля 400 чалавек, тым самым прадстаўлялі самае буйное аматарскае аб’яднанне горада. У першы перыяд дзейнасці, прыкладна да 1903 г., плённа працавалі ўсе секцыі: праводзілі літаратурныя серады і музычныя вечары, ставілі спектаклі, нават сумесныя з прыезджымі прафесійнымі артыстамі, адкрывалі мастацкія выставы і музычныя класы і інш. На пасяджэннях літаратурнай секцыі выступалі лектары з Масквы і Пецярбурга, літаратурныя серады з удзелам вядомых крытыкаў, гісторыкаў і публіцыстаў не маглі ўмясціць усіх жадаючых. У газеце «Северо-Западный край» адзначалася, што таварыства спрабуе зменшыць прыток слухачоў і гледачоў – аматараў прыгожых мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першыя гады дзейнасць таварыства выходзіла за карпаратыўныя межы і прыцягвала значную колькасць мінчан. Першым масавым агульнагарадскім мерапрыемствам можна лічыць святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна. Была створана арганізацыйная камісія, у якую ўвайшлі гарадскі галава граф К. Чапскі, заснавальнік Таварыства мінскіх урачоў доктар С. Лунц, будучы гарадскі галава М. Райкевіч, Я. Чырыкаў, А. Аляксандраў і інш. [5, спр. 6645, л. 27]. Да падрыхтоўкі былі далучаны настаўнікі і вучні мінскіх гімназій і вучылішч. Камісія прапанавала адкрыць у горадзе грамадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна. Аматары прыгожых мастацтваў удзельнічалі таксама ў агульнарасійскім зборы сродкаў на помнікі А. С. Пушкіну і А. М. Астроўскаму.

Урачыстасці пачаліся 25 мая 1899 г. Перад вялікай колькасцю слухачоў, вольных месцаў не засталося, А. Аляксандраў са сцэны гарадскога тэатра прачытаў драму «Барыс Гадуноў», а А. Хаванскі на эстрадзе летняга тэатра – аповесць «Арап Пятра Вялікага». 27 мая была паказана праграма з твораў А. С. Пушкіна, да выканання якой былі прыцягнуты ўсе творчыя сілы таварыства. У памяшканні гарадскога тэатра гучаў аркестр, хор выканаў кантаты, урачыстую прамову сказаў член праўлення. На «біс» быў успрыняты прачытаны А. Аляксандравым верш Ю. М. Лермантава «На смерць паэта». Вялікую цікавасць у прысутных выклікалі так званыя «жывыя карцінкі»: «Пушкін у сяле Міхайлаўскім» і «Каўказскі нявольнік». У гэты ж дзень у мінскім рэальным вучылішчы прайшлі народныя чытанні з дэманстрацыяй «туманных карцінак» па пушкінскай тэматыцы. Адзначым, што мерапрыемства было платным і выручаныя сродкі пайшлі на адкрыццё бібліятэкі імя А. С. Пушкіна [5, спр. 1414, л. 67].

Святкаванне юбілею А. С. Пушкіна, ажыццёўленае Таварыствам аматараў прыгожых мастацтваў, можна аднесці да адной з самых значных падзей сацыякультурнага жыцця Мінска на рубяжы стагоддзяў. Арганізуючы культурна-асветніцкія мерапрыемствы таварыства некаторы час супрацоўнічала з гарадскім камітэтам Апякунства народнай цвярозасці, які выдзяляў сродкі на правядзенне народных чытанняў, спектакляў і падтрымку іншых ініцыятыў. Як сведчаць сучаснікі, спектаклі драматычнай секцыі заўсёды праходзілі пры перапоўненых залах, а на народных чытаннях захапленне выклікалі «туманныя карцінкі». Частка бясплатных білетаў на народныя чытанні, якія праводзіліся рэгулярна па нядзелях, раздавалася чайным апякунствам і кнігарням. Але знайшліся гандляры, якія, перахапіўшы бясплатныя білеты, рабілі грошы на папулярнасці мерапрыемства.

Разумеючы важнае значэнне асветніцтва, таварыства працягвала работу ў гэтым кірунку і пасля спынення супрацоўніцтва з гарадскім камітэтам Апякунства народнай цвярозасці, які палічыў, што дзейнасць таварыства не спрыяе зніжэнню п’янства. Пашыраецца тэматыка народных чытанняў за кошт цікавасці да фізікі, астраноміі і іншых навук. 30 студзеня 1905 г. пачаліся публічныя папулярныя лекцыі па гісторыі і літаратуры, якія чыталі настаўнікі гімназіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таварыства ажыццяўляла актыўную культурную працу, галоўным чынам разлічаную на сяброў суполкі. Плённа працавалі ўсе чатыры секцыі, асабліва драматычная. Рэжысёрам спачатку выступаў А. Аляксандраў, таму што меў папярэдні вопыт, а пазней запрашаліся прафесійныя рэжысёры. Ставілі п’есы А. М. Астроўскага, А. П. Чэхава, М. Горкага і інш. Асабліва ўдалай была пастаноўка п’есы «На дне», першая на аматарскай сцэне. У музычнай секцыі склаўся вельмі добры хор і аркестр рускіх народных інструментаў, якія выязджалі на гастролі ў павятовыя гарады. У лютым 1903 г. адбыўся першы агульнадаступны канцэрт, а ў лістападзе гэтага ж года адкрыліся бясплатныя музычныя класы, у якія запісалася каля 80 слухачоў. На пасяджэннях літаратурнай секцыі рабіліся агляды часопісаў, навінак мастацкай літаратуры, адбываліся лекцыі, якія чыталі як сябры таварыства, так і запрошаныя лектары. Тэматыка была разнастайнай: «А. І. Герцэн», «Аб паэзіі Гейнэ» і г. д. Мастацкая секцыя стала ініцыятарам правядзення ў 1899 г. выставы твораў мастакоў, якія ўваходзілі ў Таварыства перасоўных выстаў, экспанаваліся работы У. Макоўскага, М. Касаткіна, І. Рэпіна і інш. [9, с. 131]. Пазней секцыя змагла арганізаваць тры выставы мясцовых прафесійных мастакоў і аматараў.

Выклікае павагу творчы падыход кіраўніцтва аб’яднання да арганізацыі дзейнасці, ахоп усіх знакавых гістарычных і культурных падзей. Напрыклад, у 20-годдзе з дня смерці І. С. Тургенева падрыхтавалі літаратурна-драматычны вечар, на якім быў прачытаны даклад аб творчасці пісьменніка, паказана камедыя «Сняданне ў прадвадзіцеля», выконваліся ўрыўкі з іншых твораў. Практыкаваліся сумесныя мерапрыемствы некалькіх секцый, напрыклад музычнай і драматычнай ці літаратурнай.

Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў пэўным чынам праявіла сябе ў рэвалюцыйных падзеях 1905 г., калі на яго мерапрыемствах праводзілася рэвалюцыйная агітацыя. Напрыклад, у зале таварыства 18 лютага падчас лекцыі па творчасці А. П. Чэхава сабралася да тысячы чалавек, раздаваліся антыўрадавыя выкрыкі «Далоў самадзяржаўе!», а потым натоўп выйшаў на вуліцу. У памяшканні таварыства распаўсюджваліся нелегальныя пракламацыі, некалькі членаў праўлення мелі дачыненне да іх друкавання. Вядомы дзеяч беларускага нацыянальнага руху А. Луцкевіч згадваў: «…Як звычайна, зыходзіліся палітычныя дзеячы на гутаркі і нарады ў зале таварыства» [7, с. 7]. Пазначаныя факты прывялі да закрыцця аб’яднання ў ліпені 1906 г.

Адначасова самыя актыўныя члены таварыства пачалі рыхтаваць дакументы для адкрыцця літаратурна-артыстычнага таварыства як пераемніка забароненага, прымаючы ўсе яго даўгі. Губернатар быў супраць, нават звярнуўся за падтрымкай да П. А. Сталыпіна, аднак яму было ўказана, што папярэдзіць антыўрадавую дзейнасць аматарскіх аб’яднанняў шляхам забароны немагчыма. Новае таварыства фактычна скапіравала статут Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў і заяўляла аб тых жа мэтах і формах дзейнасці. На жаль, не было жадання арганізоўваць агульнагарадскія мерапрыемствы і літаратурна-артыстычнае таварыства пе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раўтварылася ў своеасаблівы закрыты клуб для рускай інтэлігенцыі горада. Дзейнасць яго паступова згасала, і ў лютым 1910 г. яно было выключана з рэестра таварыстваў і саюзаў. Ці з'яўлялася яго пераемнікам Мінскае таварыства прыхільнікаў музыкі, уключанае ў рэестр у лістападзе 1912 г., і якой была яго дзейнасць, акрамя адкрыцця для яго членаў бібліятэкі-чытальні, з-за адсутнасці матэрыялаў сказаць немагчыма.

Сярод самых разнастайных аб'яднанняў дзейнічалі і суполкі нацыяналістычнага кірунку. Напрыклад, 27 студзеня 1907 г. быў заснаваны рускі жаночы гурток з мэтай «объединения русских православных людей во имя любви к родине» [5, спр. 7953, л. 27]. Старшынёй з'яўлялася жонка губернатара Л. Ф. Гірс, аб'ядноўваў гурток 174 чал., з іх 100 жанчын [8, спр. 153, л. 21]. Якімі метадамі збіраліся дасягнуць пастаўленай мэты? На першым месцы былі чытанні па гісторыі Паўночна-Заходняга краю і Мінскай губерні, стан выбарнай справы, культурна-бытавыя асаблівасці краю [8, спр. 153, л. 40]. Відавочна, што Мінская губерня разглядалася як спрадвечная частка Расіі і таму ўсе праблемы асэнсоўваліся з гэтага пункта погляду. У гурток уваходзілі самыя вядомыя ў горадзе і за яго межамі нацыяналістычна настроеныя асобы – Г. Шміт, Д. Скрынчанка, А. Бяляеў і інш. Русафільства праяўлялася самым прымітыўным вобразам. У архіўнай справе ёсць цікавае пісьмо нейкай П. Ярохавай, у якім яна на дзвюх старонках распавядае аб ветлівасці і прыстойнасці, што пануе ў Расіі на балах, а Мінск – горад яўрэйскі, нічога цікавага не адбываецца, і толькі гурток у стане змягчыць норавы [8, спр. 153, л. 62, 63]. Галоўнымі прычынамі цяжкасці працы ў Мінску, на думку яго арганізатараў, было тое, што ён «населен главным образом инородцами, чуждыми целям организации», а руская частка насельніцтва «весьма обмежевана» [5, спр. 7953, л. 5 адв.].

Польскамоўнае насельніцтва Мінска таксама атрымала правы на свае аматарскія аб'яднанні, аднак стварэнне іх пачалося пасля з'яўлення ўрадавых пастаноў, выдадзеных пад уплывам рэвалюцыйных падзей, у якіх паляк-сепаратыст ужо разглядаўся як менш страшны вораг, чым бунтуючы селянін ці рэвалюцыянер [3, с. 343]. 26 красавіка 1905 г. быў апублікаваны «Закон аб таварыствах», у якім з мэтай кантролю за дзейнасцю таварыстваў і саюзаў прадугледжвалася стварэнне губернскай (гарадской) па справах аб таварыствах прысутнасці на чале з губернатарам ці прадвадзіцелем дваранства. Па законе ўсе аб'яднанні падпарадкоўваліся губернатарам. Правілы ад 1 мая 1905 г. дапускалі карыстанне мясцовымі мовамі ў аматарскіх аб'яднаннях, аднак за рускай мовай захоўвалася пануючая пазіцыя ў справаводстве і перапісцы. Нарэшце, 4 сакавіка 1906 г. былі зацверджаны «Часовыя правілы аб аб'яднаннях і саюзах». Аматарскае таварыства можна было зацвердзіць без дазволу Міністэрства ўнутраных спраў пры ўмове выканання 124 пунктаў [2, спр. 2649, л. 42].

У снежні 1906 г. быў заснаваны польскі клуб «Ognisko», ядро якога склаў гурток аматараў сцэны, створаны вясной 1905 г. Членства ў клубе адразу стала прэстыжным, ужо ў студзені 1907 г. уступныя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

членскія ўзносы складалі 2000 рублёў, а ў 1913 г. у клубе было зарэгістравана 224 чал. [15, с. 71]. Старшынёй праўлення стаў князь І. Друцкі-Любецкі – уласнік маёнтка Новае Поле пад Мінскам. Князь быў дастаткова вядомым паэтам, аўтарам вершаваных драм «Szatan», «Reitan», «Konstytucja 3 Maja» і інш. Драма «Szatan» была пастаўлена ў Мінску і выклікала вялікае захапленне гледачоў. У Вільні адбылася пастаноўка яго ж гістарычнай драмы «Tak umirali litwini», якая атрымала вялікае публічнае прызнанне [16, с. 10]. Сярод членаў праўлення былі М. Дабравольская, інжынер У. Крыньскі, прадпрымальнік і юрыст Ф. Барсук, адвакаты Б. Гласко, Э. Івашкевіч і інш. Драматычная секцыя клуба часта ставіла спектаклі, арганізоўвала вечары і разнастайныя забаўляльныя мерапрыемствы, якія, безумоўна, карысталіся вялікім поспехам не толькі сярод польскамоўнага насельніцтва горада.

У красавіку 1907 г. было заснавана аматарскае таварыства «Сокал», старшынёй якога з’яўляўся Вітальд Ванькові́ч. Яно складалася з дзвюх спартыўных – гімнастычнай, якая налічвала больш за 80 чалавек, і воднай, драматычнай і музычна-вакальнай секцый. Таварыства мела бібліятэку, якую падараваў доктар Чэрмкоўскі, і часопісную чытальню, што налічвала некалькі дзясяткаў перыядычных выданняў на розных мовах. Аснову матэрыяльнага дабрабыту складала дзейнасць драматычнай секцыі, якую ў 1908–1909 гг. узначальваў артыст драмы Т. Рэйф-Арлоўскі, а з 1910 г. – былы артыст калішскай трупы, а затым кіраўнік драматычнай секцыі таварыства «Лютня» ў Вільні Эдмунд Купецкі. Секцыя налічвала больш за 30 членаў, спектаклі ставіліся кожныя два тыдні. Музычна-вакальная секцыя пачала дзейнічаць у 1913 г., мела аркестр і хор пад кіраўніцтвам Альшэўскага [15, с. 74].

Тым не менш занепакоенасць станам «польскай справы» ў Мінску выказвала прэса Прывісленскага краю. Варшаўская «Swiat» у артыкуле «Minsk Litewski» са шкадаваннем адзначала, што ў горадзе пражывае каля 20 тыс. палякаў, аднак польскай прэсы няма, і яны не толькі не ў стане ўтрымаць польскі тэатр, але нават не жадаюць наведваць прадстаўленні гастралюючых польскіх труп [16, с. 10]. Як пацвярджанне сказанаму нагадаем, што калі ў 1913 г. у Мінск на гастролі прыехала трупа пад кіраўніцтвам Т. Рэйтана-Астроўскага, яе спектаклі не мелі поспеху, і трупа распалася. Аўтар артыкула выказвае незадавальненне тым, што польскія таварыствы не прыцягнулі да сябе ўсіх палякаў і не здолелі супрацьстаяць моцнаму вонкаваму ўплыву.



«Swiat» высока ацэньвае дзейнасць асветніцкай арганізацыі «Oswiata», якая, на яе погляд, высока нясе сцяг ведаў сярод мінскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

люду. Аднак, на думку газеты, недахоп прывілеяў і правоў у гэтага аб'яднання зводзіць дзейнасць да мінімуму, таму што яго статут не дазваляе арганізацыю курсаў і сталых школ. Таварыства мела бясплатную чытальню, пэўную колькасць папулярных часопісаў, аказвала дапамогу ў прыватным навучанні, што магчыма было толькі для заможных сямей. Карэспандэнт з абурэннем піша: «Няма ні аднаго нумара "Мінскага слова", у якім бы д-р Шміт не звяртаў увагу на прысутнасць у Мінску небяспечнага элемента, што спрыяе антыўрадавым настроям» [7, с. 11].

Заўважым, такую сітуацыю можна лічыць заканамернай, нягледзячы на той факт, што пасаду гарадскога галавы больш за два дзесяцігоддзі, пачынаючы з 1891 г., займалі асобы каталіцкага веравызнання. Можна выказаць думку, што ў іх было некалькі іншае ўяўленне аб ролі польскамоўнага насельніцтва, якое лічыла Мінск родным горадам і зусім натуральна ўспрымала шматэтнічнае і шматканфесіянальнае гарадское асяроддзе.

Да аматарскага аб'яднання, якое злучыла прадстаўнікоў самых розных колаў губернскага Мінска, можна аднесці Таварыства аматараў прыродазнаўства, археалогіі і этнаграфіі, занесенае ў рэестр таварыстваў і саюзаў Мінскай губерні 21 красавіка 1912 г. Праз год у яго складзе налічвалася 106 чалавек. Праграма таварыства прадугледжвала даследаванне разнастайных бакоў развіцця Мінскай губерні: геалогія, батаніка, метэаралогія, гідралогія, лесаводства, сельская гаспадарка, антрапалогія, этнаграфія, статыстыка, археалогія і інш. Планавалася займацца аховай прыроды, распаўсюджваннем прыродазнаўчых, гістарычных і геаграфічных ведаў, а таксама прадугледжвалася стварэнне гісторыка-прыродазнаўчага і этнаграфічнага музея. Акрамя гэтага мелі намер арганізоўваць навуковыя сходы, конкурсы, экскурсіі, публічныя лекцыі, наладжваць кантакты з рускімі і замежнымі вучонымі, утрымліваць для навуковых даследаванняў станцыі, лабараторыі, музей, бібліятэку, выдаваць навуковыя працы і дапаможнікі [11, лл. 1–3].

З прыведзенай вытрымкі вынікае, што таварыства ставіла мэтай навуковую і навукова-папулярную дзейнасць, плануемыя шырокія і складаныя задачы патрабавалі значных навуковых сіл і фінансавых сродкаў, а не было ні першых, ні другіх. Ахопленыя цікавай ідэяй і перспектывай, адказныя асобы таварыства адмаўляліся ад выплат і вялі справу за асабісты кошт. Не было і свайго памяшкання, таму збіраліся то ў губернскай земскай управе, то ў мужчынскай гімназіі.

Ініцыятарамі заснавання таварыства сталі неадменны член Мінскага аддзялення Сялянскага пазямельнага банка М. П. Маслоўскі і старшы раённы спецыяліст па кормаздабыванні А. П. Чорны. У склад савета таварыства абраны А. Ф. Флёраў – дырэктар Мінскай доследнай балотнай станцыі, пасля яго замяніў А. Т. Кірсанаў, П. А. Смародскі – член Мінскай земскай управы, В. А. Янчэўскі – прысяжны павераны, М. Н. Кузняцоў – інжынер-гідратэхнік, І. М. Шэмігонаў – кіраўнік Мінскага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей, Ф. М. Ястрэмскі – старшыня губернскай казённай палаты, У. Б. Крупскі – старшыня Мінскага таварыства ўзаемнага крэдыту, вучоныаграном, памешчык А. Снітко, ура-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давы аграном М. Вельямінаў-Зярноў, губернскі ўрачэбны інспектар С. М. Урванцаў і інш.

У ганаровыя члены таварыства абралі губернатара Я. Я. Эрдэлі, які садзейнічаў адкрыццю таварыства, і генерала І. І. Жылінскага, вядомага сваімі работамі на карысць краю, у пажыццёвыя – Р. А. Скірмунта.

Відавочна, што з пералічаных асоб толькі некаторыя мелі ўяўленне аб спецыфіцы прафесійнай навуковай працы, астатнія сапраўды былі аматарамі. Прычым многія з іх удзельнічалі ў іншых мінскіх таварыствах – урачоў, дабрачынных, сельскіх гаспадароў і інш. Назіралася і такая карціна, характэрная і для іншых аб'яднанняў, – запісваліся ў склад таварыства, а членскія ўзносы не плацілі. Такіх неплацельшчыкаў у 1913 г. было 20 чалавек, у 1914 г. больш і г. д., сярод злосных неплацельшчыкаў аказаўся і І. І. Луцэвіч.

Асобае месца ў таварыстве займала этнаграфічная секцыя, якая мела статус самастойнага органа з праграмай, старшынёй і сакратаром, правам весці перапіску, арганізоўваць лекцыі і запрашаць кампетэнтных лектараў. Ініцыятыву па арганізацыі дзейнасці секцыі і стварэнні адпаведнай камісіі ўзяў на сябе І. А. Загурскі, прысяжны паверены.

У праграме секцыі падкрэслівалася, што ў сферу яе дзейнасці ўваходзяць усе народнасці Мінскай губерні – беларусы, палякі, яўрэі, татары, стараверы, чамусьці аднесеныя да народнасці. Як першапачатковая ўмова пачатку работы разглядалася неабходнасць збору крыніц па этнаграфіі Беларусі на ўсіх мовах і складання бібліяграфічнага паказальніка, для чаго планавалася ўвайсці ў перапіску з усімі адпаведнымі таварыствамі. Наступным крокам павінна была стаць калекцыя этнаграфіі, да стварэння якой заклікаліся як удзельнікі таварыства, так і мясцовыя памешчыкі, народныя настаўнікі. Прадугледжваліся збор народнай традыцыйнай вопраткі, кустарных вырабаў, дамашняй мэблі, земляробчых прылад, музычных інструментаў, ажыццяўленне замалёвак узораў, арнаментаў, здымкаў цэркваў, касцёлаў, сінагог; запіс песень, замоў, народнай медыцыны, складанне адраса-календара па Мінскай губерні аб тых, хто валодае этнаграфічнай калекцыяй і г. д. Вучоны аграном, памешчык А. К. Снітко прапанаваў арганізаваць з членаў таварыства экспедыцыі па зборы матэрыялаў па асобных этнаграфічных рэгіёнах губерні. Як бачым, і план і шляхі яго выканання былі правільнымі, аднак ні сродкаў, ні кадраў, ды і вольнага часу ў дастатковай колькасці не было [11, лл. 11, 12, 15].

Тым не менш этнаграфічная секцыя сабрала дастаткова цікавую калекцыю, напрыклад, самаробную стрэльбу, 23 прадметы дамашніх промыслаў, 6 пакрывалаў і дываноў ручной работы, 18 ручнікоў, 17 спадніц, 6 паясоў, 9 вышытых кашуль і г. д. Такі набор этнаграфічных матэрыялаў, а таксама археалагічных, як, напрыклад: асколак метэарыта, які перадаў губернатар Я. Я. Эрдэлі, зуб маманта, розныя акамянеласці, і заалагічных: чучала птушак, калекцыі матылькоў і іншае – дазволілі этнаграфічнай секцыі таварыства арганізаваць выставу ў маі 1913 г. [11, лл. 54–57]. Віленскае таварыства саматужных промыслаў абяцала правесці сваю выставу. Было шмат прапаноў, напрыклад С. Д. Камінскі параіў выставіць калекцыю мастака С. А. Гінзбурга па яўрэйскіх рытуалах. Аднак, калі дайшла справа да выбараў камітэта выставы, яны не адбыліся, бо не было жадаючых.

Уся асноўная работа лягла на плечы І. А. Загурскага. На выставе, арганізаванай у памяшканні, арандаваным пад музей у доме Федаро-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віча па вул. Захар'еўскай, прадугледжваліся аддзелы этнаграфіі, мастацкі, археалагічны і невялікі аддзел прыроды. Падтрымалі ідэю і многія мясцовыя мастакі. Настолькі былі ўпэўнены ў поспеху выставы, што чакалі прыбытак у 3000 руб. Цікавы факт з пункта гледжання сучаснага музеязнаўства: адзін з членаў таварыства прапанаваў стварыць на выставе «дзіцячы куток» і выставіць вырабы дзяцей. Прапанову не падтрымалі. Выстава адбылася, аднак калі І. А. Загурскі рабіў даклад аб яе выніках на пасяджэнні таварыства і задаў пытанне аб мэтазгоднасці правядзення такой выставы зімой 1913/14 г., то прысутныя выказаліся адмоўна [11, л. 71].

Такім чынам, Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, археалогіі і этнаграфіі можна разглядаць як прыклад аб'яднання людзей розных прафесій і рознай этнічнай прыналежнасці. Сярод іх былі навукоўцы, чыноўнікі, прадстаўнікі інтэлігентных колаў, многія з'яўляліся аматарамі навуковых пошукаў і ведаў, іншыя зацікаўлена ставіліся да гісторыка-культурнай спадчыны наогул і Мінскага краю ў прыватнасці. За дастаткова кароткі тэрмін існавання таварыства змагло стаць прыкметнай з'явай у грамадскім, культурным і навуковым жыцці Мінска, аб чым сведчаць факты супрацоўніцтва з іншымі суполкамі.

Сацыякультурнае жыццё губернскага Мінска на рубяжы стагоддзяў вызначалася культурнай і этнічнай разнастайнасцю, і разам з тым выразнай талерантнасцю і ўзаемасувязямі. Своеасаблівай ілюстрацыяй сказанага стала пахаванне А. Аляксандрава, які заўчасна памёр у 1910 г. падчас знаходжання ў сталіцы па справе адмены працэнтнай нормы для яўрэяў у адной з навучальных устаноў, на грошы якіх яна і ўтрымлівалася. Жыхары горада ўрачыста хавалі паважанага чалавека. Па словах Я. Чырыкава, «огромную толпу провожающих, в которой русские, поляки, евреи соединились на время в один поток скорбящих по друге своем людей, эскортировало достаточное количество властей видимых, конных, и невидимых, пеших: осматривались венки, в числе которых были от друзей-поляков и друзей-евреев» [12, с. 24].

Падсумоўваючы, можна адзначыць заканамернасць актывізацыі працэсу фарміравання сацыякультурнага асяроддзя ў губернскім Мінску на рубяжы XIX–XX стст., што характарызаваўся ўсплескам грамадскай актыўнасці шматэтнічнай інтэлігенцыі горада. Пэўную эвалюцыю перажыла і дзяржаўная палітыка, якая вагалася ад стрымлівання і абмежавання мясцовай ініцыятывы ў другой палове XIX ст. да аднослай свабоды ў стварэнні нават «инородных» грамадскіх аб'яднанняў пасля падзей 1905 г.

Тэндэнцыі развіцця сацыякультурнай сітуацыі ў Мінску на рубяжы XIX–XX стст. характарызаваліся рысамі як агульнымі для больш-менш буйных гарадоў еўрапейскай Расіі, так і спецыфічнымі, уласцівымі для гарадоў Паўночна-Заходняга краю. Перш за ўсё – шматканфесіянальнасць і этнічная стракатасць гарадскога насельніцтва, па-другое – моцныя эканамічныя пазіцыі буйных землеўласнікаў, што выпрацавалі адпаведную іх інтарэсам форму аб'яднання, якая аказвала прыкметны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё Мінска. У той жа час культурная сітуацыя ў горадзе знаходзілася ў значнай ступені пад уздзеяннем грамадскай актыўнасці рускамоўнай інтэлігенцыі і чыноўніцтва, якія таксама мелі свае аб'яднанні. У дакументах не сустракаецца фактаў аб супрацьстаянні паміж гэтымі этнічнымі групамі насельніцтва, як і паміж іншымі. Наадварот, ёсць шмат сведчанняў супрацоўніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звяртаюць на сябе ўвагу прыклады зацікаўленасці асаблівасцямі беларускай народнай культуры і спробы яе трансляцыі. Усё пазначанае вышэй садзейнічала фарміраванню спрыяльнай сацыякультурнай сітуацыі ў губернскім Мінску на рубяжы XIX–XX стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Баргдановіч, А. І.* Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі (1861–1900) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. І. Багдановіч. – Мінск, 2003. – 103 с.
2. Віцебск. Па справах аб таварыстве // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 2649. – Воп. 1.
3. Западные окраины Российской империи / науч. ред.: М. Долбилов, А. Миллер. – М. : Новое литературное обозрение, 2007. – 608 с.
4. Канцылярыя Віцебскай губерні // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 1430. – Воп. 1.
5. Канцылярыя мінскага губернатара // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 295. – Воп. 1.
6. *Козляков, В. Е.* Национальные проблемы Беларуси в конце XIX – нач. XX в. / В. Е. Козляков // Этнографическое развитие Беларуси в XIX – нач. XX в. : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 19–20 мая 2010 г. – Минск : Издат. центр БГУ, 2011. – С. 7–12.
7. *Луцкевіч, А.* За двадцаць пяць гадоў (1903–1928) / А. Луцкевіч. – Мінск : БСЭ, 1991. – 63 с.
8. Мінскі павятовы прадвадзіцель дваранства // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 321. – Воп. 1.
9. *Пракапцова, В. П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі / В. П. Пракапцова / Мінск : БУК, 1999. – 210 с.
10. *Туманова, А. С.* Общественные организации и русская публика в начале XX века / А. С. Туманова. – М. : Новый хронограф, 2008. – 320 с.
11. Фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. – КП 6901.
12. *Чириков, Е.* Собр. соч. : в 17 т. / Е. Чириков. – М. : Моск. книгоизд-во, 1916. – Т. 17. – 275 с.
13. *Шибеко, З. В.* Минск : страницы жизни дореволюционного города / З. В. Шибеко, С. Ф. Шибеко. – Минск : Полымя, 1990. – 381 с.
14. *Шыбека, З. В.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя) / З. В. Шыбека. – Мінск : ЭўроФорум, 1997. – 297 с.
15. Informator o towarzystwach naukowych, oswiatowych… na Litwe i Rusi Bialej / zestawiony przez Michala Brenstejna. – Wilnia, 1914. – 347 s.
16. Minsk Litewski // Swiat. – 1909. – T. 7. – C. 8–13.


*M. BYASPALAYA*

## PECULIARITIES OF FORMING SOCIO-CULTURAL SITUATION IN MINSK AT THE TURN OF THE XIX–XX CENTURIES

*The author examines the complex process of forming socio-cultural situation in provincial Minsk at the end of the 19th and at the beginning of the 20th centuries which was determined by such expressive feature as simultaneous coexistence of different ethnic cultures in the city space. Attention is paid to the objective law of activization of cultural life in Minsk during the certain period, the influence of assimilation policy of the ruling circles, peculiarities of the city socio-cultural situation.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ